Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

15 лютага 2011 года, № 3 (2041)

АКТУАЛЬНА

## БДУ ў 10 % найлепшых навучальных установ свету



***Webometrics апублікаваў чарговую версію найлепшых вышэйшых установ свету. Сярод 13 тысяч ВНУ, якія падлягалі ацэнцы, у Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта высокае 1474-е месца.***

Першыя 10 месцаў у рэйтынгу Webometrics, абнародаваным у студзені 2011 г., займаюць амерыканскія ўніверсітэты. Узначальвае яго Масачусецкі тэхналагічны ўніверсітэт, пасля ідуць Гарвард і Стэнфард. З краін СНД найбольш высокія пазіцыі ў Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Ламаносава (386) і Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта (838 месца) .

Па версіі Webometrics, у топ-10 беларускіх ВНУ ўваходзяць таксама Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт (2441), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі (2994), Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (4000), Беларуская медыцынская акадэмія паслядыпломнай адукацыі (4503), Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (5662), Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт (5692), Акадэмія паслядыпломнай адукацыі (5845), Мінскі інстытут кіравання (6028) і Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт (6299).

Усяго Webometrics ацаніў 36 беларускіх ВНУ.

Рэйтынг Webometrics лічыцца адным з самых аўтарытэтных у свеце. Ён складаецца даследчай групай Cybermetrics Lab, якая з'яўляецца часткай найбуйнейшай даследчай групы CSIC пры іспанскім Міністэрстве адукацыі.

Webometrics двойчы ў год аналізуе дзейнасць універсітэтаў па прысутнасці ў інтэрнэце. У дадзены момант на ўліку каля 13 тыс. адукацыйных устаноў з амаль 18 тыс. ВНУ, уключаных у Сусветную базу вышэйшай адукацыі (WHED).

Каментуючы гэту навіну СМІ, рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка адзначыў, што ў свеце існуе некалькі вядомых агенцтваў, якія ранжыруюць універсітэты, але рэйтынг Webometrics найбольш поўны і аб'ектыўны з іх, таму што ў ім аналізуецца максімальная колькасць ВНУ без тэрытарыяльных і моўных абмежаванняў (напрыклад, у вузкаспецыялізаваным рэйтынгу газеты «Таймс» вядзецца ўлік пераважна англамоўных ВНУ зыходзячы з ацэнак выпускнікоў працадаўцамі). У інтэрнэце ж зараз прысутнічаюць практычна ўсе ВНУ, і гэта рэальна адлюстроўвае іх дзейнасць. Тут бяруцца пад увагу публікацыі (у т. л. хатнія старонкі прафесараў) з усімі спасылкамі, адукацыйныя курсы, мерапрыемствы і г. д. Па меркаванні рэктара, уздыму БДУ вельмі паспрыяла мадэрнізацыя ўніверсітэцкага сайта, праведзеная ў 2009 г., і далейшая мэтанакіраваная праца па ўдасканаленні яго зместу. У пачатку 2009 г. БДУ займаў 1916 месца, а цяпер дасягнуў вартага 1474-га (прычым у 1500-цы мы ўтрымліваемся ўжо на працягу паўгода). Гэта сапраўды нядрэнна. Мы ідзём на адным узроўні з Львоўскім універсітэтам (1443) і троху апярэджваем Кіеўскі нацыянальны імя Т. Шаўчэнкі (1576). Прычым сярод беларускіх ВНУ БДУ – безумоўны лідар. І, улічваючы, што яны таксама вельмі стараюцца, гэта надзвычай прыемна. Тым не менш Сяргей Уладзіміравіч лічыць, што БДУ трэба працаваць яшчэ лепш і павышаць свае паказчыкі, бо гэтую інфармацыю вывучаюць замежныя студэнты пры выбары ВНУ для працягу сваёй вучобы. Тое ж тычыцца і еўрапейскіх калегаў.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Калаж Аляксандра РЫТАВА

Чытайце ў нумары:

ГЕРОІ СССР І БДУ
Нарыс пра выкладчыкаў БДУ, якія за свае ратныя подзвігі падчас вайны ўшанаваліся званнем Героя Савецкага Саюза
Стар. 2

СТУДЭНТЫ ГОДА-2010
Знаёмімся з найлепшымі студэнтамі альма-матар па выніках адпаведнага конкурсу
Стар. 3

СЯРЭБРАНАЯ «ЗОРКА»
Жаночая каманда па футболе «Зорка-БДУ» заняла 2-е месца на чэмпіянаце ў вышэйшай лізе
Стар. 4

ПАДЗЕЯ

## ЦЭНТР ДЛЯ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ ПРАГРАМІСТАЎ

*26 студзеня на базе факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ быў адкрыты Цэнтр кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях (ЦКІТ). Ён размясціўся па вуліцы Рэвалюцыйнай, 11.*

ЦКІТ павінен павысіць узровень падрыхтоўкі студэнтаў і выкладчыкаў БДУ па сучасных IT-дысцыплінах, а таксама эканоміцы, фінансах і ўліку. Іх навучанне будзе арганізавана ў рамках рэалізацыі ўніверсітэцкіх праграм вядучых сусветных вендараў, якія ахопліваюць значную частку IT-рынку Беларусі:

1. Праграма сеткавай акадэміі Cisco;
2. IBM Academic Initiative – універсітэцкія праграмы IBM;
3. Праграма ўніверсітэцкага альянсу SAP;
4. Акадэмічная ініцыятыва Oracle Academy на трох узроўнях;
5. Адукацыйная праграма Microsoft, якая ўключае такія кірункі, як інавацыі ў вучэбным працэсе, праграмы ліцэнзавання для выкладчыкаў і студэнтаў, падтрымка студэнтаў і маладых спецыялістаў у правядзенні алімпіяд і канферэнцый;
6. Праграмныя прадукты 1С .

Цэнтр IT-кампетэнцый створаны ў адпаведнасці з дамовамі аб супрацоўніцтве паміж БДУ і кампаніямі альянсу IBA–СП ЗАТ «Міжнародны дзелавы альянс» і ІП «IT-парк». Універсітэту ў якасці спонсарскай дапамогі былі перададзены 22 сучасныя камп'ютары з выхадам у інтэрнэт і падключэннем да сервераў кампаній IBA праз оптавалаконны канал.



Фота Аляксандра СНАПКА

*С.У. Абламейка і С.В. Ляўцееў націскаюць сімвалічную кнопку загрузкі ЦКІТ*

Супрацоўніцтва з ВНУ становіцца важным кірункам дзейнасці многіх IT-кампаній. Стварэнне ўласных кафедраў, правядзенне семінараў, алімпіяд, курсаў павышэння кваліфікацыі, падтрымка студэнцкіх праектаў – частка іх адукацыйнай дзейнасці. Сувязь узаемавыгадная: ВНУ атрымліваюць найноўшыя праграмныя прадукты і тэхналогіі, пераўтвараючыся ў цэнтры інавацый, IT-кампаніі – магчымасць удзельнічаць у падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для праектаў.

Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі з'яўляюцца вельмі дынамічнай галіной, за якой з цяжкасцю паспяваюць дзяржаўныя стандарты і вучэбныя планы. У рамках акадэмічнай праграмы кампаніі ствараюць вучэбныя цэнтры, асноўная задача якіх – дапамагчы студэнтам ВНУ набыць у дадатак да вышэйшай адукацыі веды і навыкі, якія запатрабаваны IT-рынкам.

Падчас адкрыцця Цэнтра кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях рэктар БДУ Сяргей Абламейка адзначыў шматгадовы ўклад IBA ў інавацыйнае развіццё нашага ўніверсітэта. Ён падкрэсліў, што ЦКІТ можа паспрыяць наладжванню супрацоўніцтва БДУ з вядучымі сусветнымі IT-кампаніямі ў рамках іх адукацыйных ініцыятыў, і адзначыў вялікі аб'ём арганізацыйнай і метадычнай працы, зробленай у гэтым кірунку супрацоўнікамі ФПМІ. У сваім выступленні генеральны дырэктар IBA Сяргей Ляўцееў выказаў упэўненасць, што вучэбны цэнтр «паслужыць на карысць інтэлектуальнаму і творчаму развіццю новага пакалення праграмістаў». Сімвалічны ключ з рук кіраўніка IBA атрымаў дырэктар цэнтра Сяргей Маркаў.

У адкрыцці цэнтра ўзялі ўдзел дэкан ФПМІ Павел Мандрык, дырэктар асацыяцыі «Інфапарк» Уладзімір Басько, а таксама Міхаіл Маханёк – кіраўнік прадстаўніцтва Microsoft у Беларусі, Аляксандр Сарокін – кіраўнік універсітэцкай праграмы IBM па краінах СНД, Андрэй Філатаў – дырэктар дэпартамента апаратнага забеспячэння IBM па краінах СНД, Юлія Жукава – спецыяліст па вучэбных праграмах інфармацыйна-сэрвіснага цэнтра SAP СНД.

**Ганна ЛАГУН**

## Весткі з рэктарата

УДЗЯЧНЫЯ ЛІСТЫ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь атрымалі 11 лютага ў Адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска пяць супрацоўнікаў БДУ: прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях *Уладзімір Сувораў*, заг. культурна-масавага аддзела ўпраўлення па справах культуры Аляксандр *Ігнатчык*, нам. начальніка псіхалагічнай службы *Валянціна Абрамовіч*, заг. інфармацыйна-ідэалагічнага сектара УВРМ *Дзмітрый Лебедзь*, дацэнт Інстытута журналістыкі БДУ *Алена Конанава*.

* * *

ДЫРЭКТАР Інстытута аэракасмічнай адукацыі Вакаяма (Японія) доктар Акіяма Хіраакі, прадстаўнік Цэнтра тэхналогій інавацыйных нанаспадарожнікаў Такійскага ўніверсітэта Ісібасі Канеоры і прэзідэнт Літоўскай аэракасмічнай асацыяцыі Відмантас Томкус сустрэліся 24 студзеня з кіраўніцтвам БДУ і дырэктарам Цэнтра аэракасмічнай адукацыі БДУ Уладзімірам Саечнікавым. Абмяркоўваліся магчымасці далучэння БДУ да міжнароднага праекта па распрацоўцы адукацыйных нанаспадарожнікаў, які каардынуецца Такійскім універсітэтам, а таксама праекты пагадненняў аб супрацоўніцтве.

* * *

ГАНАРОВАЕ званне «Заслужаны работнік БДУ» прысвоена 14 супрацоўнікам за шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўклад у развіццё ВНУ. Узнагароджаны: загадчык лабараторыі НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі *Анатоль Будай*; прафесар ФПМІ *Міхаіл Буза*; галоўны навуковы супрацоўнік НДІ ФХП *Павел Гапонік*; намеснік прарэктара па навуковай рабоце начальнік НДЧ–ГУН *Таццяна Дзік*; прафесар юрыдычнага факультэта *Андрэй Дулаў*; загадчык кафедры гістарычнага факультэта *Юрый Казакоў*; загадчык лабараторыі НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі *Міхаіл Ксенафонтаў*; загадчык кафедры хімічнага факультэта *Леанід Круль*; загадчык кафедры ФРКТ *Міхаіл Кугейка*; галоўны навуковы супрацоўнік НДЛ гідраэкалогіі біялагічнага факультэта *Тамара Міхеева*; прафесар ММФ *Рэгіна Тышкевіч*; дацэнт філалагічнага факультэта *Дзмітрый Фёдараў*; дырэктар НП РУП «Актыў БДУ» *Валерый Хадасевіч* і загадчык кафедры фізічнага факультэта *Віталь Ямны*.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ДА 90-ГОДДЗЯ БДУ



# Героі СССР і БДУ

## Частка 1

***У Беларускім дзяржаўным універсітэце заўсёды працавалі і працуюць шмат вядомых асоб. Аднак Героі Савецкага Саюза складаюць асобную катэгорыю, бо дзякуючы іх воінскім подзвігам мы маем магчымасць мірна жыць і тварыць у роднай краіне.***

### ГАРОШАК ПАВЕЛ АНТОНАВІЧ



Нарадзіўся 10 чэрвеня 1925 г. у в. Нова-Нікалаеўка Фёдараўскага раёна, Башкірыя. Скончыў сем класаў Пакроўскай сярэдняй школы, у верасні 1941 г. паступіў у Сцерлітамакскі медыцынскі тэхнікум.

У лютым 1943 быў прызваны ў Чырвоную Армію. Стаў курсантам Рыжскага ваеннага пяхотнага вучылішча, якое размяшчалася ў Сцерлітамаку. Ужо з чэрвеня 1943 г. радавы Павел Гарошак удзельнічаў у баях. Спачатку на Курскай дузе, а потым і на Дняпры.

Свой подзвіг Павел Антонавіч здзейсніў менавіта пры фарсіраванні гэтай ракі. 22 верасня 1943 г. мотастралковы батальён, дзе ў кулямётнай роце служыў П. Гарошак, фарсіраваў Днепр. Пры захопе плацдарма на правым беразе была паранена дзяўчына – санінструктар 1-га батальёна, і на яе месца быў прызначаны П. А. Гарошак. Ён разам з баявым падраздзяленнем першым пераправіўся праз Днепр, дапамог 26 байцам і камандзірам, вынес з зоны абстрэлу пад агнём варожай артылерыі 32 параненых байцоў са зброяй.

17 лістапада 1943 г. атрымаў званне Героя Савецкага Саюза. Пры афармленні дакументаў была зроблена памылка друку – прозвішча Гарошчык было надрукавана як Гарошак. З-за таго, што ўсе ўзнагародныя дакументы былі выпісаны на імя П. А. Гарошака, ён быў вымушаны пагадзіцца на змененае прозвішча.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны П. А. Гарошак скончыў танкавае вучылішча. У 1946 г. малодшы лейтэнант дэмабілізаваўся. Па нацыянальнасці Павел Антонавіч быў беларусам, таму пасяліўся на радзіме.

У 1951 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут, працаваў у Міністэрстве дзяржкантролю Беларусі, органах дзяржбяспекі, быў міністрам юстыцыі Беларусі.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі.

У Башкартастане ўвекавечана памяць Героя Савецкага Саюза. Яго імя на гранітнай стэле ў парку Перамогі ва Уфе, на мемарыяльнай дошцы на будынку медтэхнікума ў Сцерлітамаку.

Памёр 19 кастрычніка 1994 г.

### ЖМУРОЎСКІ ДЗМІТРЫЙ ПЯТРОВІЧ



Нарадзіўся 10 студзеня 1918 г. у в. Барысавічы Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Вучыўся ў Магілёўскім педагагічным інстытуце. У Чырвоную Армію прызваны ў ліпені 1941 г. Са жніўня 1941 г. на Бранскім, Калінінскім, 2-м Украінскім франтах. Удзельнік Курскай бітвы, Корсунь-Шаўчэнкаўскай і Яска-Кішынёўскай аперацый.

26 сакавіка 1944 г. узвод, у якім знаходзіўся кулямётчык 936-га стралковага палка (254-я стралковая дывізія, 52-я армія, 2-і Украінскі фронт) Д. П. Жмуроўскі, у ліку першых пераправіўся цераз р. Прут і ў баях за плацдарм за трое сутак адбіў 20 варожых контратак. 31 сакавіка ў баях за в. Кырпіцы (14 км на поўнач ад г. Ясы) Жмуроўскі асабіста знішчыў ці не цэлы ўзвод варожых салдат і афіцэраў, быў паранены, але поле бою не пакінуў.

«Кулямётчык 936-га палка 254-й стралковай Чаркаскай Чырвонасцягавай дывізіі (52-я армія) Жмуроўскі вылучыўся ў баях на тэрыторыі Малдовы і Румыніі пры фарсіраванні ракі Прут.

Узвод добраахвотнікаў раніцай 31 сакавіка 1944 г. на двух плытах бязгучна накіраваўся да варожага берагу. Фашысты позна заўважылі адважных салдат. Ад асвятляльных ракет стала светла, нібы ўдзень. Ад шалёнага кулямётна-артылерыйскага агню рака ўзнялася на дыбкі. Аднак дзевяць адважных воінаў з двума кулямётамі дасягнулі берагу. Жмуроўскі прыняў камандаванне жменькай байцоў і загадаў хутка акапацца. Ворага чакалі нядоўга. Фашысты спяшаліся ліквідаваць маленькі плацдарм. Жмуроўскі загадаў падпусціць ворага бліжэй. Кулямёты з пяцідзесяці метраў, ва ўпор, ударылі па фашыстах. Першая атака ворага захлiснулася. Колькі іх было потым – не было каму лічыць. Ствалы кулямётаў не паспявалі астываць. У бой ішла і трафейная зброя. Гімнасцёркі воінаў сцямнелі ад поту. Ад напругі нылі рукі, хацелася піць. Але бой не сціхаў. Жменька байцоў адбіла дванаццаць атак і забяспечыла пераправу батальёна. Сустрэць падаспелых таварышаў змаглі толькі чацвёра цяжка параненых байцоў».

Званне Героя Савецкага Саюза Дзмітрыю Пятровічу Жмуроўскаму прысвоена 13 верасня 1944 г.

Пасля вайны закончыў Маскоўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, затым аспірантуру, стаў доктарам гістарычных навук (1973), прафесарам (1974). З 1950 г. на выкладчыцкай працы ў ВНУ Вільнюса, Масквы, Мінска, з 1960 г. – у БДУ. Д. П. Жмуроўскі – аўтар шэрагу манаграфічных даследаванняў.

### ЖОЛУДЗЕЎ НАВУМ ІЛЬІЧ



Нарадзіўся 13 студзеня 1922 г. у Гомелі. Працаваў токарам на станкабудаўнічым заводзе. У Чырвонай Арміі з кастрычніка 1941 г. На фронце з лютага 1942 г. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў. Камандзір мінамётнага разліку малодшы сяржант Н. І. Жолудзеў быў адзначаны пры фарсіраванні Дняпра.

Ён адзін з першых у палку 29 верасня 1943 г. саматугам пераправіўся праз Днепр у раёне сяла Келебярда Крамянчугскага раёна Палтаўскай вобласці. Пасля высадкі на беразе ён адразу ўсталяваў мінамёт і адкрыў агонь, прыкрываючы пераправу пяхотных падраздзяленняў 3-га стралковага палка. У баі за ўтрыманне і пашырэнне плацдарма 5 кастрычніка 1943 г., калі фашысты падышлі ўшчыльную да мінамётнай пазіцыі, прыняў рукапашны бой. Мінамётчыкі адбіваліся аўтаматным агнём, гранатамі, прыкладамі, сапёрнымі рыдлёўкамі. Яго разлік знішчыў тры агнявыя пункты разам з цэлай ротай гітлераўцаў. У гэтых баях Н. І. Жолудзеў быў паранены, але застаўся ў страі.

Званне Героя Савецкага Саюза Навуму Ільічу Жолудзеву прысвоена 12 снежня 1943 г. за праяўленую мужнасць і гераізм пры фарсіраванні Дняпра.

У 1950 г. закончыў Мінскі юрыдычны інстытут. Да 1970 г. у Савецкай Арміі, падпалкоўнік юстыцыі, затым юрысконсульт «Белспортлато». Памёр 9 снежня 1985 г.

Узнагароджаны ордэнам Леніна (1943), ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені (1985), медалямі.

### ЖУКАЎ ГЕОРГІЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ

Ваенны і дзяржаўны дзеяч. Маршал Савецкага Саюза, чатыры разы ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза (1939, 1944, 1945, 1956).

Нарадзіўся 1 снежня 1896 г. у в. Стралкоўка Калужскай вобласці. Удзельнік Першай сусветнай вайны, малодшы унтэр-афіцэр, узнагароджаны двума Георгіеўскімі крыжамі. У Чырвонай Арміі з 1918 г. У гады Грамадзянскай вайны камандаваў узводам і эскадронам, а пасля вайны – эскадронам, кавалерыйскім палком і брыгадай.



У 1930 г. паспяхова скончыў курсы вышэйшага камсаставу. У 1926–1931 гг. выкладаў у БДУ курс «Вышэйшая дапрызыўная ваенная падрыхтоўка студэнтаў». У 1938–1939 гг. служыў намеснікам камандуючага Беларускай Асобай ваеннай акругі. Летам 1939 г. войскі пад камандаваннем Жукава акружылі і разграмілі галоўныя сілы 6-й японскай арміі на р. Халхін-Гол (Манголія). 28 верасня 1939 г. за гэта яму было прысвоена першае званне Героя Савецкага Саюза. У студзені–ліпені 1941 г. – начальнік Генштаба, намеснік наркама і намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны Жукаў праявіў сябе як вялікі палкаводзец XX ст. Камандуючы войскамі Ленінградскага фронту, Жукаў, выкарыстоўваючы надзвычай жорсткія меры, дабіўся стабілізацыі фронту і не здаў Ленінград. У бітве пад Масквой Жукаў не толькі адстаяў сталіцу, але і арганізаваў войскі Заходняга фронту для паспяховага контрнаступлення. У 1942 г. Жукаў каардынаваў дзеянні франтоў у Сталінградскай бітве. У 1943 г. маршал Савецкага Саюза Жукаў узначальваў войскі і дабіўся перамогі ў Курскай бітве, фарсіраванні Дняпра, вызваленні Кіева. У 1944 г. разграміў ворага ў Корсунь-Шаўчэнкаўскай і Праскуроўска-Чарнавіцкай аперацыях. За каардынацыю франтоў у Беларускай аперацыі быў узнагароджаны другой «Залатой Зоркай» Героя. У 1944–1945 гадах камандаваў войскамі 1-га Беларускага і 1-га Украінскага франтоў у Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях. 8 мая 1945 г. Жукаў быў старшынёй на пасяджэнні прадстаўнікоў саюзнага камандавання на падпісанні Акта аб безумоўнай капітуляцыі Германіі і падпісаў яго ад імя СССР. У чэрвені Жукаў на Чырвонай плошчы ў Маскве прымаў парад Перамогі.

Памёр Г. К. Жукаў 18 чэрвеня 1974 г. Пахаваны на Чырвонай плошчы ля Крамлёўскай сцяны. Бронзавы бюст устаноўлены на радзіме героя. Яго імем названы вуліцы ў многіх гарадах, у тым ліку ў Мінску, Гомелі, Слуцку.

### ЗАЙЦАЎ МІКАЛАЙ ЯКАЎЛЕВІЧ



Нарадзіўся 10 сакавіка 1923 г. у пасёлку Крупкі Мінскай вобласці.

«... Сам я з Крупак, нарадзіўся ў сям'і пуцявога абходчыка. Хатка ў нас, як і ва ўсіх працоўных чыгуначнай станцыі, была маленькай і стаяла недалёка ад чыгункі. Юнацтва прайшло пад грукат вагонных колаў ... Сакавік 1941-га. Прыходзіць да нас у клас афіцэр з райваенкамата. «Хто, – пытае, – хоча ў лётчыкі?» Ад радасці ў мяне заспявалі паджылкі: я хачу! Вось яна, мая мара! Пад Мінскам, на базе 121-й вучэбнай эскадрыллі, прайшоў тэарэтычную падрыхтоўку. 15 мая паехаў у Гомель. Вучыўся лётаць на У-2. Вайна...»

У Чырвонай Арміі з 1941 г. Закончыў 3-ю Чкалаўскую авіяцыйную школу пілотаў (1943). Служыў лётчыкам-інструктарам. З лютага 1944 г. на 1-м і 4-м Украінскіх франтах: лётчык, камандзір звяна, намеснік камандзіра эскадрыллі штурмавога палка (224-я штурмавая авіяцыйная дывізія, 8-ы штурмавы авіяцыйны корпус, 8-я паветраная армія). Удзельнік вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі. Здзейсніў 185 баявых вылетаў, правёў 15 паветраных баёў, збіў 2 самалёты праціўніка, знішчыў каля 20 танкаў, больш за 20 аўтамабіляў, 43 гарматы, вывёў са строю 20 чыгуначных вагонаў, нанёс ворагу вялікі ўрон у жывой сіле.

Званне Героя Савецкага Саюза Мікалаю Якаўлевічу Зайцаву прысвоена 29 чэрвеня 1945 г.

«Здараецца, пытаюць, за які подзвіг нададзена мне званне Героя Савецкага Саюза. Сустрэч шмат, аўдыторыі самыя розныя: школьнікі, навучэнцы ПТВ, студэнты ўніверсітэтаў, працоўныя або, нарэшце, мае земляки ў Крупках. І ўзнікае адно і тое ж пытанне... Пэўна, шмат хто думае, што «Залатую Зорку» давалі абавязкова за нейкі адзін яскравы подзвіг... Не, не заўсёды. Я атрымаў яе, уласна кажучы, за баявыя вынікі ўсіх сваіх вылетаў... У кагосьці стаяў за гэтым гераізм аднаго бою, аднаго парыву, у іншых усё складвалася інакш...»

У 1950 г. закончыў Вышэйшыя афіцэрскія лётна-тактычныя курсы. З 1960 г. – палкоўнік. У 1967 г. закончыў БДУ, з 1967 г. – выкладчык універсітэта. Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, 3 ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

### КІРСАНАЎ АЛЯКСАНДР ВАСІЛЬЕВІЧ



Нарадзіўся 23 снежня 1898 г. у Казані. У Чырвонай Арміі з 1920 г. Удзельнік Грамадзянскай вайны. Скончыў артылерыйскае аддзяленне Аб'яднанай ваеннай школы (Кіеў, 1926), Ваенную акадэмію Генеральнага штаба (1949).

З верасня 1941 г. ваяваў на Паўднёвым, Сталінградскім, Цэнтральным і Беларускім франтах. Адзначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Чарнігаўскай вобласці. У ноч на 28 верасня 1943 г. стралковая дывізія пад камандаваннем А. В. Кірсанава пераправілася праз раку, захапіла плацдарм і паспяхова адбіла шматлікія контратакі пераўзыходных сіл праціўніка.

У сваёй кнізе «На шляху да пералому», якую генерал-лейтэнант Іван Андрэевіч Ласкін падарыў «баявому сапратніку і сябру» Аляксандру Васільевічу Кірсанаву ў 1977 г., аўтар напісаў: «Усе, канешне, ваявалі добра, былі падрыхтаванымі і мужнымі афіцэрамі. Але Кірсанаў неяк асабліва непакоіўся за выкананне баявой задачы і разам з тым быў экспансіўным, калі можна так сказаць, наступальным... На любы выпад ворага ён адразу адказваў энергічнымі артылерыі і заўсёды дабіваўся поспеху... У любы, самы нечаканы момант ён імгненна ацэньваў сітуацыю і знаходзіў самых разумных спосабы дзеянняў. Камдзіў вельмі цаніў кожнага чалавека...»

У кожным баі – за Адэсу, Феадосію, Сталінград, Курск, Брэст, Варшаву, Вісмар – камандзір абдумваў усё да дробязяў. За глыбокую думку, за высокую адукаванасць, за падсвядомае прытрымліванне прынцыпу «не рабі непрыемнасцяў іншаму» яго, безумоўна, цанілі.

Ён лічыў, што тое, што ён рабіў, было правільным. І гэта было аб'ектыўна так, бо пацвярджалася добрым стаўленнем да яго таварышаў па службе. Ужо ў 46 гадоў яго называлі «Бацем». І ў яго заўсёды быў мех пісьмаў...

Званне Героя Савецкага Саюза Аляксандру Васільевічу Кірсанаву прысвоена 15 студзеня 1944 г.

24 чэрвеня 1945 г. генерал-маёр Кірсанаў удзельнічаў у гістарычным парадзе Перамогі на Чырвонай Плошчы ў Маскве.

За гады вайны яго імя 21 раз згадвалася ў зводках і загадах Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. У 1949 г. пасля заканчэння Ваеннай акадэміі Генштаба быў прызначаны намеснікам камандзіра паветрана-дэсантнага корпуса (Полацк), а потым – начальнікам Вышэйшых афіцэрскіх курсаў Паветрана-дэсантных войскаў.

Са жніўня 1955 па 17 верасня 1960 г. А. В. Кірсанаў служыў начальнікам спецкафедры БДУ, а ў 1960–1974 гг. працаваў на пасадзе прарэктара Белдзяржуніверсітэта.

А. В. Кірсанаў – кавалер ордэнаў Леніна (двойчы), Чырвонага Сцяга (чатыры разы), Суворава II ступені, Кутузава II ступені, Айчыннай вайны I ступені. Ён з'яўляецца Ганаровым грамадзянінам гарадоў Чарнігаў, Брагін і Калінкавічы. Памёр 18 лістапада 1994 г.

**Па матэрыялах Музея гісторыі БДУ**

ВІНШУЕМ!

# Студэнты года-2010

***Падведзены вынікі штогадовага конкурсу «Студэнт года БДУ». Сярод найлепшых з лепшых названы таленавітыя навукоўцы, спартсмены, актывісты і творчыя людзі. Лаўрэаты падзяліліся з намі сакрэтамі свайго поспеху і планамі на будучыню.***

## НАМІНАЦЫЯ «НАВУКА»

**Максім ЛЕАНЕНЯ, магістрант ФРКТ**



*Лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац па фізіцы 2008 і 2009 (паўправадніковыя лазеры), стыпендыят спецыяльнага фонду прэзідэнта 2009. Мае 8 артыкулаў у навуковых часопісах (з іх 2 за мяжой). Сувыканаўца міжнароднага навуковага праекта з Рыжскім тэхнічным універсітэтам у рамках міжурадавага пагаднення (2008–2009). Аўтар шэрагу вынаходстваў.*

– Званне «студэнт года» абавязвае мяне не спыняцца на дасягнутым і ісці далей. Таму галоўная мэта зараз – стаць высокакваліфікаваным спецыялістам і авалодаць унікальнымі ведамі ў галіне лазернай фізікі. Яшчэ, магчыма, абараніць кандыдацкую, а затым і доктарскую... Напрацаваць такія веды і вопыт, у якіх будуць зацікаўлены іншыя людзі. Хочацца стварыць нешта новае, цікавае, магчыма, прыбытковае.

**Андрэй СКРЫБА, студэнт 5 курса ФМА**



*Лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў ВНУ РБ 2009 г. Навуковы інтарэс – сусветная эканоміка і адносіны, супрацоўніцтва РБ з краінамі блізкага і далёкага замежжа, энергетычная бяспека і г. д. У 2010 г. А. Скрыба быў уключаны ў «Кнігу рэкордаў БДУ» як самы малады пераможца згаданага конкурсу, ды яшчэ з найбольшай колькасцю публікацый. З'яўляецца неаднаразовым пераможцам рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцый і алімпіяд, лаўрэат спецфонду прэзідэнта РБ. Лаўрэат конкурсу «Студэнт года БДУ» за 2008/09 навуч. г.*

– Вакол нас адбываецца мноства габальных працэсаў, неверагодна складаных і заблытаных. Так ці інакш яны ўплываюць на наша жыццё. Навучыцца разумець гэтыя працэсы, быць уцягнутым у абмеркаванне многіх праблем сусветнай палітыкі і эканомікі – гэта ўсё тое, дзеля чаго варта займацца навуковай дзейнасцю. І калі ты даследуеш якое-небудзь пытанне, таму што гэта цікава, то абавязкова будзе добры вынік. Да таго ж мне пашанцавала, што сфера маіх навуковых інтарэсаў у большасці супадае з тымі дысцыплінамі, якія я вывучаю. Гэта, канешне ж, дапамагае мне і ў вучобе. Навука стала часткай майго жыцця, і адмаўляцца ад яе я пакуль не збіраюся.

## НАМІНАЦЫЯ «ЛІДАР»

**Дар'я ШЫК, студэнтка 5 курса ММФ**



*Старшыня Савета старастаў БДУ. Адна з галоўных арганізатараў шэрагу факультэцкіх мерапрыемстваў. Пераможца конкурсу прыгажосці «Міс ММФ». Прымала ўдзел у арганізацыі матэматычных алімпіяд і канферэнцый для школьнікаў. Лаўрэат фестывалю эстрады БДУ ў намінацыі «канферанс». Кіраўнік некалькіх моладзевых праектаў.*

– Актыўны ўдзел у грамадскім жыцці – гэта своеасаблівая сацыяльная школа, школа жыцця, якой нідзе нельга навучыцца. Тут можна займацца толькі самаадукацыяй. Не абыходзіцца і без расчараванняў: нешта не атрымліваецца ці атрымліваецца не зусім так, як хацелася б. І тады ты аналізуеш, чаму так адбываецца. А ў гэтым і ёсць цікавасць і бясцэнны вопыт. Зносіны і сумесная праца з людзьмі рознага ўзросту дапамагаюць адчуваць сябе больш упэўнена. Таксама вучаць адстойваць свой пункт гледжання, пераконваць і прызнаваць свае памылкі. Гэта важна.

## НАМІНАЦЫЯ «КУЛЬТУРА»

**Вольга МАЙСЯЁНАК, студэнтка 5 курса ФМА**



*Лаўрэат фестывалю эстрады БДУ 2008–2010 гг., удзельніца святочнай шоу-праграмы «Віват, студэнт!» у Палацы спорту, 2010 г.; лаўрэат 2-й ступені міжнароднага тэлевізійнага конкурсу эстраднага мастацтва «На высокай хвалі» (Расія, г. Сочы), 2009 г.; удзельніца дабрачынных акцый моладзевых арганізацый БДУ.*

– Песня – гэта перш за ўсё выдатная магчымасць пазнаёміцца з творчымі людзьмі. А яшчэ спевы – гэта самавыражэнне. З дапамогай песні ты дзелішся з навакольнымі тым, што сам адчуваеш і што лічыш цікавым. А спяваць можна заўсёды. Нават калі не хапае часу выступаць прафесійна на сцэне. Напрыклад, у якасці разрадкі можна паспяваць і дома. Зараз я заканчваю ўніверсітэт і спадзяюся, што выступленні на сцэне на гэтым не скончацца. Я не думаю пра прафесійную кар'еру спявачкі, але загадваць не будзем!

## НАМІНАЦЫЯ «СПОРТ»

**Аляксандр ВАХАВЯК, студэнт 4 курса юрыдычнага факультэта**



*Сярэбраны прызёр Кубка свету па дзюдо, 2-е месца Кубка прэзідэнта Расіі, 1-е месца Кубка РБ, член нацыянальнай зборнай РБ па самба і дзюдо. Пераможца Рэспубліканскай універсіяды па дзюдо 2010 г.*

У момант падрыхтоўкі нумара Аляксандр Вахавяк, што натуральна, знаходзіўся на спаборніцтвах у Францыі, таму пагутарыць з ім не ўдалося. Тым не менш віншуем яго і астатніх і жадаем поспехаў!

**Падрыхтавала Наталля КЕЗІК**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: метадаў аптымальнага кіравання, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, сацыяльнай камунікацыі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай хіміі, сацыялогіі, тэорыі і метадалогіі журналістыкі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, матэматычнай фізікі, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, метадаў аптымальнага кіравання, радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, філасофіі і метадалогіі навукі, філасофіі культуры, сацыялогіі, канстытуцыйнага права, паліталогіі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, фізічнага выхавання і спорту, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, нямецкай мовы;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220030, г.Мінск, вул.Бабруйская,5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ**

*запрашае студэнтаў 4-5 курсаў і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на перападрыхтоўку па спецыяльнасцях:*

- **Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве гасцінічнай і рэстараннай гаспадаркі** (кваліфікацыя «эканаміст»);
- **Менеджмент турысцкай арганізацыі** («менеджар»).

*Тэл. (017) 209-59-71, (029) 269-69-72, (029) 133-50-16.*

- **Прамысловая экалогія і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў** («інжынер-эколаг»);
- **Сучасная замежная мова** («перакладчык-рэферэнт»);
- **Рэкламны менеджмент** («менеджар рэкламы»).

*Тэл. (017) 209-59-73, (029) 258-41-83, (029) 133-50-23*

Дыплом дзяржаўнага ўзору.

Формы навучання: вочная (вячэрняя) і завочная.

**Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 15**

***Сайт: www.imo.bsu.by***

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# ЗАЎСЁДЫ Ў РУХУ

***Каманда рэктарата стала пераможцам спартакіяды сярод супрацоўнікаў адміністрацыйна-кіраўнічага апарату БДУ, якая праходзіла 21–23 студзеня ў САК «Брыганціна».***



Фота Аляксандра СНАПКА

Другое месца заваявала каманда «Факультэты», а на трэцім – зборная «НДЧ–ГУН і навукова-вытворчыя прадпрыемствы».

Усяго ў спаборніцтвах удзельнічала 5 камандаў: «Рэктарат», «Факультэты», «НДЧ–ГУН і навукова-вытворчыя прадпрыемствы», «Цэнтры, філіялы БДУ» і «Агульнаўніверсітэцкія кафедры». Суперніцалі па 6 відах спорту: більярд, валейбол, настольны тэніс, лыжныя гонкі, плаванне і шахматы. Удзельнікамі спартакіяды сталі каля 200 супрацоўнікаў БДУ.

* * *

***Падведзены вынікі спартакіяды «Здароўе» сярод супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пераможцам стала каманда кафедры фізвыхавання і спорту. На другім месцы – фізічны факультэт, на трэцім – факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій.***

У спартакіядзе прынялі ўдзел каманды структурных падраздзяленняў БДУ па 8 відах спорту: армрэстлінгу, валейболе, гіравым спорце, міні-футболе, настольным тэнісе, плаванні, стрытболе і шахматах.

Узнагароджанне пераможцаў адбылося 12 лютага ў рамках акцыі «Дні здароўя», якая прайшла з 11 па 13 лютага на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу БДУ «Брыганціна» (г. п. Радашковічы).

У «Днях здароўя» прынялі ўдзел каля 300 супрацоўнікаў БДУ. Яны паказалі спартыўную падрыхтоўку ў асабістых спаборніцтвах па лыжах, валейболе, настольным тэнісе, більярдзе, футболе і шахматах. Акрамя таго, для аматараў спорту і прыхільнікаў здаровага ладу жыцця арганізавана і культурна-масавая праграма. Пераможцы ў асабістых спаборніцтвах узнагароджаны сувенірамі, астатнія ўдзельнікі граматамі і дыпломамі.

«Дні здароўя» – традыцыйная акцыя прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў БДУ з мэтай прапаганды здаровага ладу жыцця і фізічнай культуры.

**Анастасія ГАЛУБОВІЧ**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**БДУ трапіў у топ-1500 найлепшых навучальных устаноў свету** – news.mail.ru (08.02); «Ежедневник» (07.02); open.by (08.02); tut.by (08.02); «Звязда» (09.02); «Комсомольская правда» (09.02); БелТА (08.02).

**Міжнародны тыдзень пластычных мастацтваў «Куфар_Пластылін»** – БелТА (07.02); naviny.by (07.02); БелаПАН (07.02); «Советская Белоруссия» (09.02).

**Алімпіяда па інфарматыцы і вэб-праграмаванні** – БелТА (06.02).

**Інтэрв'ю з наменснікам дэкана эканамічнага факультэта, старшынёй Савета маладых вучоных БДУ Ганнай Каралёвай** – «Знамя юности» (04.02).

**Святкаванне Новага года па кітайскім календары** – «Чырвоная змена»/«Звязда» (02.02); naviny.by (03.02).

**Прыём на новыя спецыяльнасці ў БДУ** – БелТА (01.02); open.by (01.02); 21.by (01.02); tut.by (01.02); sb.by (01.02); «Знамя юности» (04.02).

**Вынікі выканання ў БДУ ў 2006-2010 гг. дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў** – БелТА (31.01); БелаПАН (31.01); open.by (31.01); 21.by; naviny.by (31.01);.

**Суперкамп'ютар «СКІФ»** – «Советская Белоруссия» (27.01).

**Вынікі першага этапу рэпетыцыйнага тэсціравання ў інтэрв'ю дэкана факультэта даўніверсітэцкай адукацыі Вячаслава Малафеева** – «Настаўніцкая газета» (25.01).

**Павышэнне платы за навучанне** – 21.by (24.01);

**Адкрыццё Цэнтра ІТ-кампетэнцый БДУ-ІВА** – Минск-новости (24.01); БелТА (25.01); «Рэспубліка» (01.02); «Настаўніцкая газета» (01.02); «Чырвоная змена»/«Звязда» (02.02).

**Сярэбраныя медалі ліцэістаў БДУ на Міжнароднай Жаўтыкоўскай алімпіядзе** – БелТА (20.01); «Минск-новости» (21.01); «Настаўніцкая газета» (27.01); «Чырвоная змена»/«Звязда» (02.02).

**Стварэнне блога рэктара на сайце БДУ** – БелТА (20.01); sb.by (20.01); tut.by (20.01); zn.by (20.01); «Звязда» (21.01); 21.by (20.01; 22.01); «Народная газета» (22.01); «Рэспубліка» (22.01); «Вечерний Минск» (25.01).

**Музей манет на гістарычным факультэце БДУ** – «Вечерний Минск» (25.01).

**Пра факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій** – «Настаўніцкая газета» (25.01).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# СЯРЭБРАНАЯ «ЗОРКА»

***16 студзеня ў сталічным футбольным манежы ва ўрачыстай абстаноўцы ўзнагароджвалі гульцоў каманды «Зорка-БДУ» – сярэбраных прызёраў чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па футболе сярод жаночых камандаў у вышэйшай лізе.***



Фота Яўгена ПАМЫТКІНА



Дзяўчаты атрымалі дыпломы і памятныя сувеніры з рук рэктара ўніверсітэта і прадстаўнікоў асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола». С. У. Абламейка і прарэктар У. В. Панарадаў ад усёй душы павіншавалі футбалістак з удалым сезонам, адзначылі годнае выступленне ўніверсітэцкай каманды ў розыгрышы 1/16 фіналу жаночай Лігі чэмпіёнаў УЕФА, а таксама заваяванне Кубка краіны 2010 г. у драматычным фінальным матчы.

За 6 гадоў існавання наша каманда 5 разоў станавілася сярэбраным прызёрам чэмпіянату краіны, двойчы заваёўвала Кубак краіны, у 2010 г. стала першым у гісторыі ўладальнікам жаночага Суперкубка РБ па футболе, а таксама з'яўляецца базавай камандай маладзевай і нацыянальнай жаночых зборных.

«Мы вельмі цэнім падтрымку ўніверсітэтам нашай каманды, супрацоўнічаем з рознымі падраздзяленнямі, у тым ліку з кафедрай фізічнага выхавання, якая аказвае нам дапамогу ў вучэбна-трэніровачным працэсе, таксама дзякуем кіраўніцтву БДУ за магчымасць выкарыстоўваць спартыўныя аб'екты ўніверсітэта ў падрыхтоўцы каманды, і, вядома, студэнтам, якія «гучна» падтрымлівалі нашых дзяўчат у самых важных матчах мінулага сезону», – прамовіла галоўны трэнер «Зоркі-БДУ» Марына Ліс.

Некаторыя футбалісткі каманды адстойваюць гонар нашай ВНУ ў Рэспубліканскай універсіядзе па футболе. Каманда БДУ пакуль не можа на роўных супернічаць з калектывамі профільных спартыўных ВНУ, аднак з году ў год набіраецца спартыўнага майстэрства пры ўдзеле вопытных спартсменак з «Зоркі-БДУ».

**Уладзімір ПІГУЛЕЎСКІ, дырэктар РЦАП па футболе БДУ**

ДАСЯГНЕННІ

# Зорны год «Юністар»

***Радыё «Юністар» стала пераможцам конкурсу «Брэнд года–2010» у катэгорыі «СМІ».***

Адна з вядучых радыёстанцый краіны, «Юністар» годна падрыхтавалася да абароны брэнда – каб паказаць усё, чым слаўнае радыё, спатрэбілася больш за 50 старонак прэзэнтацыі.

Сярод складнікаў поспеху грамматнае праграмаванне, харызматычныя вядучыя эфіру, журналісты, крэатыўны аддзел, запамінальныя акцыі і падтрымка важных падзей краіны, культурных і адукацыйных. Так, «Юністар» асвятляла ўступную кампанію БДУ, штогод надае ўвагу «Тэатральнаму куфру» і іншым універсітэцкім праектам. Сцены радыё – а гэта пакуль што і сцены БДУ – знутры высцеленыя афішамі, вінілавымі банерамі з аўтографамі сусветных зорак, чый прыезд суправаджаўся эксклюзіўнымі матэрыяламі «Юністар» (інфармацыйную падтрымку радыё аказвала канцэртам Стынга, Патрысіі Каас, Джо Кокера, Ніно Катамадзэ, Ванэсы Мэй, Элтана Джона, Крыса Ры, гуртоў А-НА, Scorpions і інш.). Калі ў міжнародны тур выправіліся «Рускія сезоны XXI стагоддзя», радыё ўзяло на сябе львіную долю арганізацыйнай працы – і ў кастрычніку 2010 г. знакамітыя балеты «Шахразада» і «Жар-птушка» былі дадзены ў Мінску, прытым ініцыятар рускіх сезонаў Андрыс Ліепа шматкроць даваў інтэрв'ю «Юністар» і нават правёў тут тры эфіры.

Запамінальнасці брэнда «Юністар» спрыяў і шэраг акцый. Напрыклад, леташні Дзень радыё супрацоўнікі «Юністар» ператварылі ў свята для ўсяго горада: з самай раніцы ўпрыгожылі вуліцы, аўтазапраўкі і крамы блакітнымі паветранымі шарыкамі, а таксама выправілі на праспект веласіпедыстаў, якія ўсім раздавалі шарыкі і добры настрой.



*Дырэктар «Юністар» Настасся Шаціла на конкурсе «Брэнд года–2010»*

Паводле даследаванняў, траціну аўдыторыі «Юністар» складае моладзь (ад 18 да 25 гадоў). Адпаведна, многія акцыі прыйдуцца па гусце нашым студэнтам, бо радыё разлічвае на хуткую рэакцыю, ініцыятыўнасць ды кемлівасць слухачоў: так, напрыклад, каб выправіцца святкаваць дзень закаханых на Кіпр, трэба было адгадаць месца, дзе знаходзіцца вядучы, паспець туды першым і рабіць так дзесяць дзён запар (акцыя «Крылатыя сэрцы»).

У хуткім часе ў студэнтаў будзе яшчэ больш нагоды настройвацца на 99,5 FM: па будных днях у палову на адзінаццатую гадзіну будзе выходзіць рубрыка, прымеркаваная да юбілею БДУ.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# «Ківін–2011» у Сочы не месца для эксперыментаў

***На Міжнародным фестывалі камандаў Клуба вясёлых і знаходлівых «Ківін–2011», што прайшоў у Сочы з 12 па 24 лютага, прымалі ўдзел не толькі наша надзея ў Найвышэйшай лізе зборная каманда БДУ і БДУІР «Мінскае Мора», але і ўдзельнікі фіналу Адкрытай лігі КВЗ БДУ–2010 «27 па Грынвічы» і «Цукар», якія вырашылі аб'яднацца перад новым для сябе выпрабаваннем – дэбютным сезонам у Першай лізе, гульні якой будуць адбывацца ў «КЗ Мінск». Пра тое, чаму сябры вырашылі стаць суцэльным арганізмам і разам уздымацца па кар'ернай лесвіцы гумару, распавёў капітан чэмпіёнаў Адкрытай лігі КВЗ БДУ–2010, каманды «27 па Грынвічы», Андрэй ШУМІЛА.***

***– Андрэй, з якой мэтай вы ехалі ў Сочы?***

– Мы ехалі на фестываль, каб атрымаць права ў гэтым сезоне выступаць у Першай лізе.

***– Каб быў больш зразумелым маштаб вашых планаў, растлумач, калі ласка, іерархію ўсіх ліг КВЗ, пачынаючы з самай галоўнай.***

– Канцавым прыпынкам, безумоўна, з'яўляецца Найвышэйшая ліга ў Маскве, удзельнікам якой сёлета стала «Мінскае Мора» дзякуючы перамозе ў Прэм'ер-лізе, якая ў сваю чаргу другая па значнасці (яе вядзе Аляксандр Масляковў-малодшы). Пасля ідуць: Першая ліга, у якой мы будзем у гэтым сезоне, і Найвышэйшая ўкраінская ліга. Затым ідуць цэнтральная ліга і міжрэгіянальныя, як, напрыклад, наш Кубак Палесся ў Гомелі...

***– Ці атрымалася здзейсніць запланаванае?***

– Фармат турніру наступны. Першыя пяць дзён рэдактары адбіраюць каманды для фінальнага гала-канцэрту. Гэта першы тур. Камандаў агулам недзе больш за 530. У другі тур, да непасрэднага выступлення перад Аляксандрам Масляковым, праходзяць каля сотні. Нават калі якая каманда не прайшла, яна мае магчымасць «засвяціцца». У журы сядзяць рэдактары розных ліг, і яны бачаць, ці зможа тая ці іншая каманда адпавядаць неабходнаму ўзроўню. Мы, на жаль, першы тур не прайшлі, але, аб'яднаўшыся з «Цукрам», свайго дамагліся. Доўга выступаем на адной сцэне, пасябравалі. Разам нам будзе лягчэй, так у нас больш патэнцыялу, больш ідэй. Гэтак жа дапамагаем «Мінскаму Мору», калі яны маюць у нас патрэбу, а «Мінскае Мора» – нам, калі такую патрэбу маем мы.



*Зборная каманда КВЗ БДУ*

***– А ці змянілася што пасля аб'яднання ў працэсе падрыхтоўкі?***

– Ды не. Усё, як і было раней. Проста нас стала больш, рэпеціруем кожны вечар, акрамя выхадных.

***– А што з назвай каманды, хто зараз будзе капітанам, як-ніяк тры былыя фронтмены ў калектыве (акрамя «Цукру» і «27 па Грынвічы», у склад уваходзіць капітан яшчэ аднаго фіналіста Адкрытай лігі БДУ, каманды «Гармоны», Рыгор Іваноў. – Аўт. )?***

– Працоўная назва «Зборная БДУ», але гэта пакуль. Наконт капітана: у нас і ў «27 па Грынвічы» выразнага лідара не было, і зараз хапае іншых пытанняў, якія вымагаюць найхутчэйшага вырашэння: неабходна пісаць новыя сцэнары, адпрацоўваць ідэі. 18 лютага будзем выступаць на фестывалі БДУ. Ужо час рыхтавацца да сезону ў Першай лізе, у якой дэбютуем у сярэдзіне сакавіка.

***– Дарэчы, пра новыя сцэнары. Ці паказвалі што-небудзь з новенькага ў Сочы?***

– Ківін не месца для эксперыментаў. Неабходна дэманстраваць толькі найлепшае, добра адпрацаванае: занадта вялікая цана, каб рызыкаваць.

***– Паўтара месяца таму, пасля перамогі ў Лізе БДУ, стаяла мэта добра выступіць на «Ківіне» і выйсці ў Першую лігу. Цяпер гэта пройдзена – што далей?***

– У нас дэбютны сезон – канкрэтнай задачы пакуль няма, галоўнае – набрацца досведу ў новым для сябе фармаце, што, між іншым, ні якім чынам не зашкодзіць нам працягваць выступленне ў Адкрытай лізе БДУ. Да таго, магчыма, дзвюма камандамі... у якіх складах, пакуль сказаць не магу.

*Пасля гаворкі з Андрэем узгадаў ягоныя «канкрэтнай задачы пакуль няма» – і ў галаву прыйшла думка: «апетыт усё ж такі прыходзіць падчас спажывання», – няхай і будзе так.*

**Алесь НОВІКАЎ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

15 лютага 2011 года
Падпісана да друку 11.02.2011 г.
Зак. . Тыраж 2000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспр. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

ПСІХАЛАГІЧНАЯ СЛУЖБА


# 7 фактаў аб псіхалагічнай службе БДУ

**1.** У 2010 г. псіхалагічнай службе БДУ споўнілася 10 гадоў. Гэта былі гады творчасці і станаўлення. Напрыклад, некаторыя буйныя праекты маюць ужо досыць працяглую гісторыю:

- з 2005 г. працуе студэнцкі псіхалагічны клуб;
- з 2006 г. праводзяцца Дні псіхалогіі;
- з 2008 г. дзейнічаюць творчая майстэрня і відэасалон.



**2.** У службе працуюць 16 спецыялістаў, з іх двое з'яўляюцца практычнымі псіхолагамі вышэйшай катэгорыі, пяцёра – першай катэгорыі. Шырока прадстаўлены спецыялізацыі, якімі авалодалі і паспяхова выкарыстоўваюць на практыцы псіхолагі службы. Гэта псіхааналіз, NLP, сімвалдрама, коўчынг, розныя віды тэрапіі, такія як гештальт, арт, танцарухальная, цялесна-арыентаваная. Прынцыпы работы спецыялістаў – «Прафесійна. Ананімна. Бясплатна».

**3.** У структуры службы дзейнічаюць 4 сацыяльна-псіхалагічныя цэнтры, на базе якіх арганізоўваюцца і праводзяцца сацыяльна-псіхалагічныя трэнінгі, пасяджэнні студэнцкага псіхалагічнага клуба, сустрэчы мужчынскага і жаночага клубаў, псіхалагічныя гасцёўні і практычныя заняткі. Для індывідуальнай работы прадугледжана 7 кансультацыйных кабінетаў. Тут любы студэнт і супрацоўнік універсітэта можа атрымаць прафесійную падтрымку і разабрацца з узніклымі псіхалагічнымі і сацыяльнымі праблемамі.

**4.** Кожны год служба арганізоўвае і праводзіць больш за 250 мерапрыемстваў. Зараз яны ўключаны ў Фестываль практычнай псіхалогіі. Місія фестывалю – аб'яднаць вакол сябе ўсіх, для каго важная і цікавая псіхалогія. Адмыслоўцы-псіхолагі іншых устаноў адукацыі, выкладчыкі, педагогі і, вядома, студэнты, – псіхалагічная служба заўсёды рада вітаць вас на фестывальных мерапрыемствах. Той, хто хоча даведацца аб глыбінях псіхікі, папрацаваць над сабой у розных напрамках, навучыцца чамусьці новаму, мае такую магчымасць. Глядзіце АНОНС МЕРАПРЫЕМСТВАЎ!

**5.** У серыі выданняў службы «Псіхалагічны спектр пазнання» з 2006 г. выйшла 6 вучэбна-метадычных дапаможнікаў і 1 даведачнае выданне. Асаблівае значэнне сярод іх маюць практыкаскіраваныя выданні «Эмацыйна-валявая самарэгуляцыя», «Псіхагігіена», «Правілы паспяховага студэнта».

**6.** На базе службы створана бібліятэка для студэнтаў. У ёй сабраны выданні па псіхалогіі (кнігі, часопісы). Бібліятэкай можа карыстацца любы студэнт універсітэта. Тут можна знайсці важную і карысную інфармацыю рознай тэматыкі: міжасобасныя адносіны, самапазнанне, асобасны рост, развіццё лідарскіх здольнасцяў і інш.

**7.** Спецыялістамі службы распрацавана больш за 30 тэматык практычных заняткаў (згуртаванне, кампетэнтныя зносіны, вырашэнне канфліктаў, самарэгуляцыя, пастаноўка мэты, тайм-менеджмент і многія іншыя). Заняткі ўключаны ў спецыяльны зборнік. Куратар, староста групы і проста ініцыятыўны студэнт могуць выбраць з яго цікавую тэму, арганізаваць на факультэце ініцыятыўную групу (выбраць дату і час, замовіць аўдыторыю), а спецыялісты-псіхолагі заўсёды гатовыя правесці заняткі. Азнаёміцца са зборнікам можна ў сацыяльна-псіхалагічным цэнтры па адрасе вул. Кастрычніцкая, 2-308, тэл. для даведак (017) 328-60-37.

# Творчая майстэрня



Студэнцтва – гэта пара не толькі вучобы, пазнання, развіцця, удасканалення, самавыхавання і г. д. Гэта яшчэ і выдатная магчымасць рэалізаваць свае здольнасці, веды і ўменні, прымаючы ўдзел у розных сацыяльных праектах. Напрыклад, нашы студэнты старэйшых курсаў з ліку актыву захацелі правесці шэраг заняткаў са студэнтамі першага курса (праект «Каманда»), а мы ў сваю чаргу навучылі іх па праграме "Згуртаванне і выяўленне лідарскага патэнцыялу».

А нехта актыўна ўдзельнічае ў валанцёрскім руху, дапамагае дзіцячым дамам, праводзіць прафарыентацыйную работу са школьнікамі, апякуе ветэранаў і людзей з абмежаванымі магчымасцямі... Але заўсёды ўзнікае неабходнасць у падтрымцы з боку дасведчаных спецыялістаў. Існуюць, здавалася б, простыя пытанні, на якія можна даць відавочныя адказы. Але не заўсёды хапае вопыту і ведаў, каб гэта зрабіць.

Так, для падтрымання моладзевых ініцыятыў і сацыяльных праектаў на базе псіхалагічнай службы была створана творчая майстэрня. Яна прызначана для тых, хто збіраецца рэалізаваць або паўдзельнічаць у якім-небудзь сацыяльным праекце.

З нашага боку гэта разнастайныя навучальныя семінары, распрацоўка сцэнарыяў, практыкумаў, падбор матэрыялаў і практычнага інструментарыю, метадычныя рэкамендацыі, кансультацыі са спецыялістамі. А ініцыятыўныя групы самастойна (ці зноў жа пры нашай падтрымцы) увасабляюць у жыццё, рэалізуюць створаныя праекты.

Такім чынам, калі вы хочаце падрыхтаваць публічнае мерапрыемства (сацыяльныя, дабрачынныя, гуманітарныя акцыі); задумаліся, як арганізаваць матэрыял і напісаць сцэнарый, імкнецеся зрабіць яго яркім і запамінальным; вам цяжка выступаць публічна, то для вас працуе творчая майстэрня, дзе можна атрымаць прафесійную кансультацыю і практычныя рэкамендацыі спецыялістаў у арганізацыі і правядзенні такіх мерапрыемстваў.

**Творчая майстэрня працуе на базе сацыяльна-псіхалагічнага цэнтра па адрасе вул. Кастрычніцкая, 2, каб. 308, тэл. (017) 328-60-37.**

## АНОНС ТРЭНІНГАЎ І ТРЭНІНГАВЫХ МОДУЛЯЎ

**Трэнінг крэатыўнасці «YELLOWы НАСТРОЙ»**

Развіццё творчых здольнасцяў у спазнанні сябе і іншых, уменне зірнуць на свет па-новаму, убачыць арыгінальнае ў штодзённым.

*Арганізацыйны сход адбудзецца **21 лютага** ў 17.00 па адрасе пр. Пераможцаў, 9-131 (інтэрнат № 4).*

*Тэл. для даведак 203-69-83.*

**Трэнінг «ЦЕЛА – ЛЮСТЭРКА ДУШЫ»**

Дзіўнае адкрыццё свайго цела, утоеных у ім магчымасцяў, уласнай энергіі, нечаканыя эмоцыі і глыбокі дыялог з сабой, новае адчуванне сябе і свайго цела.

*Арганізацыйны сход – **9 сакавіка** ў 18.00 па адрасе вул. Кастрычніцкая, 2-308 (інтэрнат № 2).*

*Тэл. для даведак 328-60-37.*

**Трэнінгавы модуль «МІЖАСОБАСНЫЯ КАНФЛІКТЫ І ШЛЯХІ ІХ ПЕРААДОЛЕННЯ»**

Развіццё ўпэўненасці ў міжасобасных адносінах, аналіз сваіх учынкаў, пошук выйсця са складаных жыццёвых сітуацый.

*Заняткі праводзяцца **10, 17 і 24 сакавіка** па адрасе вул. Курчатава, 6-8 (інтэрнат № 3). Пачатак у 18.30.*

*Тэл. для даведак 278-13-27.*

**Трэнінг «ДАВАЙЦЕ ПАГУТАРЫМ»**

Трэнінг для тых, у каго ўзнікаюць цяжкасці ў зносінах як з сябрамі, так і з незнаёмымі людзьмі. Спецыяльна падабраныя псіхалагічныя практыкаванні дапамогуць стаць больш кампетэнтным у зносінах.

*Арганізацыйны сход – **16 сакавіка** ў 18.00 па адрасе пр. Дзяржынскага 87-128 (інтэрнат № 11).*

*Тэл. для даведак 259-74-93.*

**Трэнінг «ПРАБЛЕМЫ Ў АДНОСІНАХ З БАЦЬКАМІ? ДАВАЙЦЕ ІХ ВЫРАШАЦЬ»**

Мэта трэнінгу заключаецца ў павышэнні камунікатыўнай культуры: з аднаго боку, гэта дасягненне псіхалагічнай незалежнасці ад бацькоў, з другога – захаванне блізкіх эмацыйных адносін.

*Арганізацыйны сход адбудзецца **17 сакавіка** ў 20.00 па адрасе вул. Кастрычніцкая, 2-308 (інтэрнат № 2).*

*Тэл. для даведак 328-60-37.*

**Трэнінг УПЭЎНЕНЫХ ПАВОДЗІНАЎ (ранішняя група)**

Мэта – здабыць і дэманстраваць большую ўпэўненасць у сабе, пазбавіцца сарамлівасці. Магчымасць у камфортнай абстаноўцы трэнінгавай групы апрабаваць новыя, больш упэўненыя мадэлі паводзін.

*Арганізацыйны сход – **22 сакавіка** ў 11.00 па адрасе пр. Пераможцаў, 9-131 (інтэрнат № 4).*

*Тэл. для даведак 203-69-83.*

**Трэнінгавы модуль «АД МЭТЫ ДА ВЫНІКУ»**

Тэхналогіі эфектыўнага планавання і дасягнення мэтаў. На канкрэтных прыкладах удзельнікі адпрацоўваюць навык пастаноўкі і рэалізацыі жыццёвага плана.

*Заняткі праводзяцца **23 і 30 сакавіка** ў 17.00 па адрасе пр. Пераможцаў, 9-131 (інтэрнат № 4).*

*Тэл. для даведак 203-69-83.*

# Дні псіхалогіі

***Праект «Дні псіхалогіі» рэалізуецца раз у семестр на некалькіх факультэтах і дазваляе ў кароткі тэрмін наведаць мноства мерапрыемстваў псіхалагічнай службы.***



Так, 9–11 лістапада 2010 года Дні псіхалогіі праводзіліся на біялагічным, гуманітарным факультэтах і ФРКТ з ахопам больш як 500 студэнтаў.

На прэзентацыі «Псіхалогія і псіхолаг» удзельнікі змаглі пазнаёміцца з асноўнымі напрамкамі сучаснай практычнай псіхалогіі і даведацца пра спецыфіку працы псіхолагаў. Прайшоў аўкцыён псіхалагічных паслуг – своеасаблівая латарэя, якая арыентуе ў разнастайнасці адукацыйных, дыягнастычных, фарміруючых і развіццёвых мерапрыемстваў, якія праводзяцца псіхалагічнай службай БДУ. Таксама адбылася алімпіяда па псіхалогіі, праведзены больш за дзесяць практычных заняткаў. На іх разгледжаны заўсёды актуальныя для студэнтаў тэмы: каханне, хлусні, ляноты, самарэгуляцыі і самападрыхтоўкі.

Інтэрактыўная выстава «Псіхалагічная служба БДУ» і экспрэс-дыягностыка «Пазнай сябе» працавалі ўсе тры дні. На выставе студэнты змаглі задаволіць свой інтарэс у псіхалагічных ведах, пабываць у ролі псіхолага, напісаць эсэ на тэму «Псіхалогія – гэта ...» і проста пашырыць свой кругагляд у разнастайнасці псіхалагічнай практыкі. А тыя, хто ўдзельнічаў у экспрэс-дыягностыцы, за 15–20 хвілін збіралі рамонак-характарыстыку, якая апісвае ўласцівасці памяці і ўвагі, стратэгіі паводзінаў, асаблівасці міжасобасных камунікацый. Таксама на Днях псіхалогіі быў арганізаваны брыфінг: студэнты атрымалі магчымасць задаць спецыялістам пытанні, якія іх цікавяць, і атрымаць кампетэнтныя адказы псіхолагаў службы.

Дні псіхалогіі – адкрыты праект. Нават калі вы не з'яўляецеся студэнтам факультэта, на якім праводзяцца чарговыя Дні, вы заўсёды можаце наведаць цікавую для вас праграму. Псіхалагічная служба рада вітаць усіх сяброў у якасці памочнікаў і паплечнікаў. Паспрабаваць сябе ў новай дзейнасці – гэта таксама велізарны асобасны рост!



# ДЫСТАНЦЫЙНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ

***У канцы 2010 г. адбылося дыстанцыйнае псіхалагічнае тэсціраванне першакурснікаў з удзелам больш чым 2500 студэнтаў з 17 факультэтаў БДУ. Вось некалькі цікавых фактаў:***

**Факт № 1.** БДУ нязменна разглядаецца як прэстыжная навучальная ўстанова. На гэта паказвае тое, што ў большасці рэспандэнтаў пераважае матывацыя атрымання дыплома, гэта значыць статус гэтага дакумента з'яўляецца «прынадным кавалачкам» у сістэме жыццёвых каштоўнасцяў. З іншага боку, фарміраванне сталай асобы і прафесійнай ідэнтычнасці прадугледжвае патрэбу ў набыцці агульнакультурных і прафесійна значных ведаў. Таму ў далейшым студэнтам неабходна фарміраваць у сябе іншыя віды матывацыі – здабыцця прафесіі і атрымання ведаў.

Калі вам неабходная падтрымка ў гэтым, запрашаем на псіхалагічныя заняткі «Паспяховае працаўладкаванне», «Асновы прафесійнага іміджу», «Як правільна напісаць рэзюмэ», «Кар'ера і кар'ерны рост», «Выхавай у сабе прафесіянала» і інш. Тут вы зможаце хутчэй зарыентавацца і знайсці сваё месца ў абраным вамі прафесіі.

**Факт № 2.** Трывога – непазбежны спадарожнік студэнта першага курса. Хутчэй за ўсё, яна з'яўляецца наступствам адаптацыйнага перыяду. Аднак павышаная трывожнасць негатыўна ўплывае на псіхаэмацыйны стан, працаздольнасць, увагу. Гэта нельга абмінаць. Для карэкцыі высокай трывожнасці мы прапануем наступныя заняткі: «Эмацыйная самарэгуляцыя», «Экзаменацыйны стрэс, ці Жыццё падчас сесіі», «У гармоніі з сабой, або Як змагацца з негатыўнымі эмоцыямі і станамі» і многія іншыя.

**Факт № 3.** Самапазнанне – займальны працэс. У ходзе тэсціравання студэнты змаглі азнаёміцца з асаблівасцямі сваёй асобы, тэмпераменту, характару, паводзін, зносін, самаацэнкі. Вынікі паказалі разнастайнасць тыпаў асобы, але першую чацвёрку ўтварылі:

- «Педагогі», або тыя, хто адказныя і выканаўчыя, цярплівыя і талерантныя, валодаюць навыкамі ўплыву і пераканання. Людзям дадзенага тыпу рэкамендуецца грамадская дзейнасць (прымальнымі з'яўляюцца пасрэдніцтва і медыяцыя).
- «Журналісты». Гэта людзі гнуткія, эмацыйныя, арыентаваныя на падтрымку і адабрэнне навакольных. Яны прыроджаныя даследчыкі. Максімалісты. Але часта яны далёкія ад рэальнасці, і такія супярэчнасці ствараюць павышаную трывожнасць. Для іх асаблівай рэалізацыі падыходзяць творчыя праекты і свабодныя ўмовы дзейнасці.
- «Гандляры», або сацыяльна накіраваныя асобы. Прынцыповыя, адказныя, абавязковыя. Як правіла, яны вельмі дзейсныя. Асабліва яны маюць поспех у арганізацыі ўзаемадзеяння з людзьмі. Таму ім падыдзе дзейнасць, звязаная з навучаннем іншых.
- «Адміністратары». Гэта выкаанаўцы. Для іх прынцыповая дакладнасць, строгасць, пераканаласць, каштоўнасная іерархія. Яны валодаюць значнымі арганізатарскімі якасцямі. Могуць праяўляць пэўны недахоп гнуткасці.

*Для яшчэ больш глыбокага самапазнання, разумення сябе і сваіх асаблівасцяў мы прапануем такія заняткі, як «Раскрыццё асобасных рэсурсаў», «Эфектыўнае самапазнанне», «Самапазнанне як працэс развіцця асобы», «Мой вобраз-Я» і інш.*

*Дзякуем усім удзельнікам дыстанцыйнага псіхалагічнага тэсціравання за актыўнасць!*

**Руслан ПАПОК,**
**начальнік псіхалагічнай службы БДУ**

## УВАГА!

**Запрашаем усіх на «Дні псіхалогіі» на геаграфічным, хімічным і юрыдычным факультэтах у сакавіку!**

**Дадатковая інфармацыя па тэл: (017) 328 60 37, 203 69 83**

## АНОНС ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ, ПСІХАЛАГІЧНЫХ ГАСЦЁЎНЯЎ, СЕМІНАРАЎ-ТРЭНІНГАЎ, МАЙСТАР-КЛАСАЎ

***Заняткі праводзяцца ў сацыяльна-псіхалагічных цэнтрах па адрасах:***

*Вул. Кастрычніцкая, 2-308 (інтэрнат № 2), тэл. (017) 328-60-37;*
*Вул. Курчатава 6-8 (інтэрнат № 3), тэл. 278-13-27;*
*Пр. Пераможцаў, 9-131 (інтэрнат № 4), тэл. 203-69-83;*
*Вул. Курчатава, 8-1 (інтэрнат № 10), тэл. 278-13-27;*
*Пр. Дзяржынскага, 87-128 (інтэрнат № 11), тэл. 259-74-93.*

**ЛЮТЫ**

16.02 Семінар-практыкум «Каханне і Я» (інтэрнат № 4),
17.02 Семінар-практыкум «Кола фартуны» (інтэрнат № 2),
21-23.02 Цыкл заняткаў «Межы мужнасці» (інтэрнат № 2),
24.02 Гасцёўня «Рэцэпты шчаслівых адносін» (інтэрнат № 10),
28.02 Семінар-трэнінг «Пасткі антызносін» (інтэрнат № 2).

**САКАВІК**

03.03 Гасцёўня «Межы жаноцкасці» (інтэрнат № 10),
03.03 Гасцёўня «Дарыць радасць» (інтэрнат № 4),
04.03 Гасцёўня «Мужчыны з Марса, жанчыны з Венеры» (інтэрнат № 11),
02–07.03 Цыкл заняткаў «Межы жаноцкасці» (інтэрнат № 2),
07.03 Семінар-практыкум «Паспяховае працаўладкаванне» (інтэрнат № 2),
10.03 Семінар-трэнінг «Рэлакс, або Вучыся расслабляцца» (інтэрнат № 10),
14, 21.03 Семінар-трэнінг «Імідж спецыяліста» (інтэрнат № 2),
16.03 Семінар-практыкум «Антынікацін, або Як зрабіць тое, пра што даўно марыш» (інтэрнат № 4),
17.03 Гасцёўня «Вось ужо гэтая дэпрэсія!» (інтэрнат № 11),
28.03 Семінар-трэнінг «Проста ў мэту» (інтэрнат № 2).

**КРАСАВІК**

04.04 Семінар-трэнінг «Эфектыўная камунікацыя» (інтэрнат № 2),
06.04 Гасцёўня «Адмова ад стэрэатыпаў, ці Як думаць нестандартна» (інтэрнат № 10),
07.04 Семінар-трэнінг «Рэлакс, або Вучыся расслабляцца» (інтэрнат № 2),
11.04 Семінар-трэнінг «Экзаменацыйны стрэс, ці Жыццё падчас сесіі» (інтэрнат № 3),
13.04 Гасцёўня «Жыць выдатна!» (інтэрнат № 11),
18.04 Ролевая гульня «Хрустальныя чалавечкі» (інтэрнат № 2),
20.04 Семінар-практыкум «Эфектыўны тайм-менеджмент» (інтэрнат № 4),
21.04 Семінар-практыкум «Адгадай эмоцыю» (інтэрнат № 2),
21.04 Семінар-трэнінг «Экзамены проста ў дзясятку» (інтэрнат № 10),
25.04 Семінар-практыкум «Паспяховае працаўладкаванне» (інтэрнат № 10),
27.04 Майстар-клас «Асновы кантактнай імправізацыі» (інтэрнат № 4),
27.04 Гасцёўня «Здаровы лад жыцця» (інтэрнат № 11).

**МАЙ**

11.05 Гасцёўня «Ад сесіі да сесіі ...» (інтэрнат № 11).
11.05 Семінар-практыкум «Крыніца багацця» (інтэрнат № 4),
11, 18.05 Практычныя заняткі «Тэхнікі зняцця псіхаэмацыйнага напружання» (інтэрнат № 2),
12.05 Семінар-трэнінг «Падары сабе мару» (інтэрнат № 10),
12.05 Семінар-трэнінг «Мастацтва кіраваць сабой» (інтэрнат № 3),
16.05 Гасцёўня «Вучыцца? Лёгка!» (інтэрнат № 2),
18.05 Семінар-практыкум «Асновы іміджалогіі» (інтэрнат № 4),
25.05 Гасцёўня «Сесія з задавальненнем» (інтэрнат № 4).

**Наконт часу пачатку заняткаў удакладняйце па ўказаных вышэй тэлефонах.**
*УВАГА! У прграме мерапрыемстваў магчымыя змены.*

## АНОНС ІНШЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

### СТУДЭНЦКІ ПСІХАЛАГІЧНЫ КЛУБ

Сустрэчы клуба
24.02 М + Ж: Баланс адносін,
31.03 Homo-conflictus: Жыццё без канфліктаў,
28.04 Фактар упэўненасці,
26.05 Свет для дваіх: Ствараем адносіны.
Відэасалон
17.03 М/ф «Масква, я люблю цябе», ці Жыццё ў малюнках,
14.04 М/ф «Пачатак», або Пазнанне сябе,
12.05 М/ф «Псіхааналітык прэзідэнта», або Як вырашыць свае праблемы.

*СПК працуе па адрасе вул. Кастрычніцкая, 2-308 (інтэрнат № 2). Тэл. для даведак (017) 328 60 37. Пачатак мерапрыемстваў – у 19.00.*

### Псіхалагічная лабараторыя *Insight*

*працуе па адрасе пр. Пераможцаў, 9-131 (інтэрнат № 4).*

Любы студэнт, які цікавіцца псіхалогіяй, можа атрымаць тут псіхалагічныя веды і навыкі, вопыт правядзення даследаванняў, эксперыментаў, трэнерскай працы з групай. Тэмы лабараторый фарміруюцца па запыце студэнтаў. Сустрэчы праводзяць спецыялісты псіхалагічнай службы БДУ, запрошаныя псіхолагі-практыкі і самі студэнты пры метадычным кіраўніцтве куратараў лабараторыі. *Тэл. для даведак 203-69-83.*

### Псіхалагічны клуб *для дзяўчат*

*працуе па адрасе пр. Пераможцаў, 9-131 (інтэрнат № 4).*

Абмяркоўваюцца адрозненні мужчынскай і жаночай псіхалогіі, пытанні ўзаемаадносін, жаночай паспяховасці і самарэалізацыі.

Сустрэчы праходзяць кожны другі панядзелак месяца (14 лютага, 14 сакавіка, 11 красавіка, 16 мая). Пачатак мерапрыемстваў – у 17.30.

**Планаваныя тэмы:** імідж і самапрэзентацыя, маніпуляцыі і ўплыў, крызісы ў адносінах і канфлікты, манеры і этыкет, пошук унутраных рэсурсаў, творчы падыход да самапазнання, мужчынская псіхалогія ад А да Я.

*Тэл. для даведак 203-69-83.*

***Інфармацыю пра работу псіхалагічнай службы БДУ*** можна атрымаць на афіцыйным сайце БДУ – bsu.by ў адпаведным раздзеле. А яшчэ створана ***электронная рассылка для студэнтаў.*** З яе дапамогай па запыце можна атрымліваць пакеты матэрыялаў па розных псіхалагічным тэматыках, падабраных спецыялістамі службы.

Рэгулярна рассылаецца ***інфармацыя пра мерапрыемствы,*** якія праводзяцца ў псіхалагічнай службе: сустрэчы студэнцкага псіхалагічнага клуба, трэнінгі, псіхалагічныя гасцёўні і інш. Усе ахвотныя могуць звярнуцца на адзін з электронных адрасоў psyservice@bsu.by або psychol_bsu@mail.ru і ***задаць пытанне,*** якое іх цікавіць, ці ***пакінуць заяўку,*** у якой неабходна сфармуляваць свае пажаданні або пытанні, якія будуць асвятляць спецыялісты псіхалагічнай службы.